

С.С. Ларыёнаў

# У тую раніцу сорак першага…

## З успамінаў пісьменніка С.С. Ларыёнава пра бой пад Сакольнічамі



Пасля вайны ў гасцях у крычаўлян пабываў член саюза пісьменнікаў СССР з Мардовіі Сяргей Сцяпанавіч Ларыёнаў. Ён сустракаўся з многімі людзьмі горада і раёна. Пабываў у краязнаўчым музеі. Яго дырэктар Міхаіл Фёдаравіч Мельнікаў пазнаёміў госця з гераічным мінулым края.

Сяргей Сцяпанавіч — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ён кавалер ордэнаў Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны». У 1941 годзе С.С. Ларыёнаў камандаваў кулямётнай ротай. Полк, у якім ён служыў, ваяваў пад Крычавам. З цяжкімі баямі адыходзілі ў той час савецкія воіны. Пісьменнік расказвае:

— Памятаю раніцу 17 ліпеня 1941 года. Мая рота заняла абарону па правы бок шашы Крычаў-Чэрыкаў, непадалёк ад вёскі Хацілавічы. Цішыня стаяла мёртвая. У 5-6 гадзін раніцы зампаліт, пільна гледзячы ў бінокль, насцярожыўся. Ён заўважыў варожыя танкі.

Машыны з чорнымі крыжамі паўзлі асцярожна і ў цішыні ліпеньскай раніцы наганялі вялікі жах, ад якога замірала сэрца і хацелася адыйсці на іншы рубеж. Але стрымлівала пачуццё адказнасці і ваенная прысяга.

Хутка, навёўшы гармату нашы артылерысты першымі пачалі бой. Выпушчаны снарад разарваўся побач з варожым танкам. Другі трапіў у цэль. Следам былі падбіты яшчэ два варожыя танкі. Немцы прыпынілі наступленне, пачалі рабіць перагрупоўку. Для нас у гэты час паступіў загад – адыйсці ў бок Крычава. Калі адыходзілі, то пачулі, што ззаду ад нас хтосьці з артылерыстаў зноў уступіў у няроўны бой з фашысцкай матарызаванай

калонай. Я аддаў загад свайму камандзіру ўзвода дабрацца да агнявой і сказаць артылерыстам, каб яны таксама адыходзілі і далучаліся да нас. Аднак камандзір узвода вярнуўся адзін і далажыў, што не знайшоў артылерыстаў.

І толькі цяпер, праз 35 гадоў, Сяргей Сцяпанавіч Ларыёнаў даведаўся, што тымі артылерыстамі аказаўся адзін Мікалай Сірацінін. Ён загінуў геройскай смерцю ў няроўным баі з ворагам.

Сяргей Сцяпанавіч пабываў на месцы боя артылерыста, усклаў кветкі да абеліска, пастаўленага ў гонар Сірацініна. Разам з пісьменнікам каля абеліска пабывалі і вучні Сакольніцкай сярэдняй школы. Тут С.С. Ларыёнаў расказаў рабятам аб мужнасці і гераізме савецкіх байцоў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а таксама на тэрыторыі Крычаўскага раёна.

Пісьменнік Сяргей Сцяпанавіч Ларыёнаў – аўтар 13 кніг. Яны выдаваліся ў Мардовіі, ў Маскве. І на гэты раз ён прыязджаў у творчую камандзіроўку, каб напісаць новую кнігу пра суровы 1941 год, пра савецкіх людзей, якія выстаялі супраць фашысцкай навалы, пра сучаснікаў, якія побач з былымі франтавікамі будуюць новае жыццё, вучацца ў іх любіць сваю Айчыну.

Я. БЯСПАЛАЎ,
В. БЫСАЎ.

НА ЗДЫМКУ: пісьменнік С.С. Ларыёнаў з вучнямі Сакольніцкай сярэдняй школы каля абеліска Мікалаю Сірацініну.

Фота У. Мінкіна